УДК 930(476)«17/18»

***Надзея Канстанцінаўна Сямашка***
*ст. выкладчык каф. дзяржаўнага кіравання*
*Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь*
***Nadzeya Siamashka***
*Senior Lecturer of the Department of Public Administration*
*of Academy of Management under the President of the Republic of Belarus*
e-mail: nk.semashko@gmail.com

# АГРАРНАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ЯК АСОБНЫ КІРУНАК У АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ 1920-х гг. – ПАЧАТКУ XXI ст.

*Разгледжаны гістарыяграфічныя даследаванні айчынных навукоўцаў 1920-х гг. – пачатку XXI ст. па сацыяльна-эканамічнай гісторыі беларускіх зямель. Першыя спробы даследавання гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі адбыліся ў 20-я гг. XX ст. Для нацыянальнай гістарыяграфіі савецкага перыяду была характэрна адаптацыя беларускай гісторыі, асабліва перыяду генезісу капіталізму, да афіцыйнага курса пры даследаванні праблем гісторыіі СССР. З пачаткам новага тысячагоддзя гістарыяграфія аграрнай праблематыкі зноў набывае актуальнасць. Назіраецца адыход ад ідэалагізаваных спробаў аналізу аграрнай гісторыі Беларусі ў параўнанні з савецкім перыядам. Зроблена выснова, што важна, каб і сёння беларуская гістарычная думка мела свой голас і ўлічвала сучасныя тэндэнцыі развіцця расійскай, еўрапейскай і сусветнай гістарычнай навукі.*

***Ключавыя словы:*** *аграрная гісторыя, айчынная гістарыяграфія, капіталістычныя адносіны, гісторыя Беларусі.*

## *The Agrarian History of Belarus as am Individual Direction in the National Historiography 1920s – Early XXI Century*

*The author considers the historiographical studies dated between the 1920s and the beginning of the XXI century by Belarusian researchers on the socio-economic history of Belarus. The first attempts to study the historiography of the agrarian history of Belarus took place in the 1920s. The national historiography of the Soviet period was characterized by the adaptation of Belarusian history, especially the period of the genesis of capitalism, to the official direction of research of USSR history. With the beginning of the new millennium, agrarian historiography issues are regaining relevance. The analysis of the agrarian history of Belarus is seen to step away from ideologized approaches of the Soviet period. It is concluded that it is essential for current Belarusian historical research to have its own voice and take into account modern trends in the development of Russian, European and world historical science.*

***Key words:*** *agrarian history, Belarusian historiography, capitalist relations, history of Belarus.*

### Уводзіны

Гістарыяграфія адыгрывае важную ролю ў структуры кожнага канкрэтнага даследавання, у вызначэнні яго задач, крыніц і метадалогіі. Веданне папярэдняга вопыту гісторыі з'яўляецца важным аспектам у пытаннях інтэрпрэтацыі фактаў, падвядзенні іх пад тыя ці іншыя паняцці і катэгорыі. Сучасныя рэаліі айчыннай гістарычнай навукі дыктуюць патрэбу ў пошуку аб'ектыўных падыходаў пры распрацоўцы новых тэорый і канцэпцый. Таму гістарыяграфічныя даследаванні не страчваюць сваёй значнасці і застаюцца актуальнымі.

Недастаткова распрацаванай застаецца тэма аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст., асабліва пытанні яе гістарыяграфіі. Сістэматызацыя матэрыялу на розных этапах развіцця гістарычнай навукі ішла пад уплывам актуальнай тэарэтыка-метадалагічнай базы. Таму высновы адрозніваліся ў залежнасці ад перыяду.

### Асноўная частка

Гістарыяграфія аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. пачынае даследавацца ў 20-я гг. XX ст. Упершыню праблему перыядызацыі гістарыяграфіі Беларусі ўзняў А. П. П'янкоў [1], і яе пачатак ён звязваў з 1921 г. – адкрыццём Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, што паспрыяла правядзенню фундаментальных даследаванняў айчыннымі гісторыкамі. Мяжу 1920-х – 1930-х гг. можна лічыць пачаткам першага перыяду ў вывучэнні

гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі і аналізу крыніц па ёй. Пацвярджэнне гэтага – выданне адметнай працы «Введение в Русскую историю (Источники и историография)» [2] аднаго з заснавальнікаў і першага рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта У. І. Пічэты. Прафесар Пічэта чытаў найбольш важныя ў прафесійным сэнсе курсы па гісторыі народнай гаспадаркі Расіі і Беларусі, крыніцазнаўстве і гістарыяграфіі. Як ён сам адзначаў, праца ўяўляе сабой толькі невялікі дапаможнік для пачатковай арыенціроўкі ў пытаннях крыніцазнаўства і гістарыяграфіі. У. І. Пічэта вызначыў «навуковыя вехі» [2, с. 3] для далейшых дэталёвых даследаванняў гістарычнай навукі. Ён правёў класіфікацыю крыніц, даў пералік асноўных архіваў, у якіх найбольш поўна прадстаўлены матэрыялы для даследаванняў, а таксама апісаў некаторыя правілы працы з крыніцамі. Навуковец заклікаў даследчыкаў вызначаць гістарычную каштоўнасць дакумента, крытычна ставіцца да яго аналізу, выкарыстоўваць максімальную колькасць крыніц для усебаковага аналізу, каб не дапускаць памылак. У. І. Пічэта адзначаў, што матэрыялы польскіх архіваў і даследаванні польскіх гісторыкаў у дачыненні да Беларусі больш поўныя і інтэнсіўныя ў адрозненне ад расійскіх, але разам з тым носяць аднабаковы «польскі» пункт гледжання [2, с. 26].

М. В. Доўнар-Запольскі ў сваёй працы «История Белоруссии» (1925) (была апублікавана толькі ў 1994 г.) вылучыў асобны раздзел, прысвечаны навуковым даследаванням Беларусі з 60-х гг. XIX ст. Ён даў кароткі агляд прац даследчыкаў, якія займаліся вывучэннем беларускіх зямель, яе культуры і насельніцтва. Навуковец вылучыў два асноўныя кірункі даследаванняў – працы польскіх і рускіх навукоўцаў, якія вывучалі гісторыю і гаспадарку Беларусі. Галоўным дасягненнем гэтых даследчыкаў, на думку М. В. Доўнар-Запольскага, было павышэнне цікавасці да мясцовай гісторыі. Ён адзначаў, што правёў толькі беглы агляд гістарыяграфіі Беларусі, бо падрабязны нарыс не з’яўляўся яго мэтай [3, с. 378].

Праца У. М. Ігнатоўскага [4] змяшчае раздзел «Цікавасць да Беларусі рускіх вучоных», у якім дадзены кароткі гістарыяграфічны агляд матэрыялаў, прысвечаных беларускай зямлі. Ён адзначыў каштоўнасць прац Я. Ф. Карскага, У. Б. Антановіча і М. Ф. Уладзімірскага-Буданава. Пры гэтым навуковец крытыкаваў змест і высновы публікацый М. В. Каяловіча. У. М. Ігнатоўскі лічыў выдатнымі гісторыкамі свайго часу М. К. Любаўскага, М. В. Доўнар-Запольскага і У. І. Пічэту [4, с. 168–170].

У студзені 1929 г. у Мінску адбылося ўрачыстае адкрыццё Акадэміі навук, створанай на базе Інбелкульта, што падрыхтавала неабходныя ўмовы для развіцця беларускай навукі. У 1932 г. у структуры Акадэміі налічвалася 14 інстытутаў, сярод якіх быў і Інстытут гісторыі.

Гістарычная думка Беларусі 30-х гг. XX ст. развівалася ў русле марксісцка-ленінскай тэорыі гістарычнага працэсу. Пацвярджэннем гэтаму з’яўляецца выданне ў 1934 г. працы В. К. Шчарбакова «Нарыс гісторыі Беларусі» [5]. Перыядызацыя гісторыі Беларусі грунтуецца тут на базе марксісцкага вучэння аб гістарычных фармацыях. Увага гісторыка была засяроджана на эканамічных працэсах і іх сацыяльных наступствах. Яшчэ адна яго праца таго часу – «Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі» [6] – фактычна стала ідэалагічным і метадалагічным падручнікам для гісторыкаў савецкага часу.

Сярэдзіна 1950-х гг. – прызнаны рубеж у развіцці савецкай гістарычнай навукі, значны і для школы гісторыкаў-аграрнікаў. У межах тэорыі сацыяльна-эканамічных фармацый гісторыкі звярнуліся да вывучэння менавіта гаспадарчага развіцця XIX – пачатку XX ст. У цэнтры ўвагі даследчыкаў былі найважнейшыя праблемы эканамічнай гісторыі Беларусі. Гісторыкі-аграрнікі займаліся вывучэннем у першую чаргу гісторыі сялянства і іх барацьбы з памешчыкамі. Трэба адзначыць і развіццё ў гэты час навукі ў вышэйшых навучальных установах: актывізавалася праца па падрыхтоўцы і абароне дысертацый, а гэта спрыяла развіццю кадравага патэнцыялу беларускай гістарычнай навукі.

Праца Д. Л. Пахілевіча «Крестьяне Белоруссии и Литвы в XV–XVIII вв.» [7] дала пачатак гістарыяграфічным даследаванням аграрнай праблематыкі, а яго артыкулы «Капиталистические зигзаги в истории феодального поместья» [8], «Крестьяне-слуги в Великом княжестве Литовском в XVII–XVIII вв.» [9], манаграфія «Крестьяне

Белоруссии и Литвы во второй половине XVIII в.» [10] сталі лагічным працягам папярэдніх даследаванняў. Д. Л. Пахілевіч вызначыў прыярытэтныя напрамкі ў вывучэнні аграрнай гісторыі краю: асаблівасці надзялення сялян зямлёй, віды і памер павіннасцей, функцыянаванне сельскай абшчыны, формы барацьбы сялян супраць феадальнай залежнасці і інш.

У манаграфіі М. М. Улашчыка «Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии» [11] былі прааналізаваны працы, апублікаваныя ў 1948–1963 гг. На падставе аналізу разнастайных крыніц, упершыню ўведзеных ў навуковы ўжытак, М. М. Улашчык распрацоўваў такія праблемы, як дэмаграфічныя працэсы ў асяроддзі сельскіх жыхароў, формы землекарыстання, галіны гаспадаркі, стан сялянскай і памешчыцкай гаспадарак, рынкавыя сувязі і сялянскі рух напярэдадні рэформы 1861 г. Аднак гістарыяграфія пытання не выходзіла за межы тэмы работы. Лагічным завяршэннем крыніцазнаўчых пошукаў М. М. Улашчыка стала яго больш позняя манаграфія «Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода» [12]. Гісторык прааналізаваў прынцыпы адбору дакументаў і даў крыніцазнаўчую ацэнку апублікаваным матэрыялам. Ён упершыню ахарактарызаваў работы дарэвалюцыйных гісторыкаў, першапраходцаў у вывучэнні гісторыі Беларусі [12]. М. М. Улашчык слушна адзначаў, што «перыяд распаду і крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы адлюстраваны слаба» [12, с. 5]. Гісторык адзначаў, што ў крыніцах перыяду феадалізму тэрміны «Белоруссия», «белорусский народ» амаль што не сустракаюцца, і называў шэраг імен гісторыкаў, працы якіх паспрыялі ўспрыманню Беларусі як самастойнай палітычнай і адміністрацыйнай адзінкі.

Працягам гістарыяграфічнага агляду аграрнай гісторыі Беларусі XVIII ст. з’яўляецца манаграфія П. Г. Казлоўскага «Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII – XVIII в.» [13], дзе ва ўступнай частцы прааналізаваны работы даследчыкаў па аграрнай гісторыі Беларусі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стст. Аўтар указваў, што працы савецкага гісторыка Д. Л. Пахілевіча мелі «прынцыповае значэнне для вывучэння аграрнай гісторыі Беларусі» [13, с. 6]. Аднак яго аналіз выкарастанай літаратуры не мае пэўнай сістэмы, аўтарскай канцэпцыі і, больш таго, не дае поўнага ўяўлення аб гісторыі пытання.

Да той жа катэгорыі гістарыяграфічных аглядаў адносіцца першы раздел манаграфіі В. У. Чапко «Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX ст.» [14], якая ўяўляе сабой неадназначную спробу крытыкі даследаванняў папярэднікаў. Можна пагадзіцца з заўвагай гісторыка наконт буржуазна-дваранскай гістарыяграфіі, у якой сапраўды адсутнічалі даследаванні, прысвечаныя сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. Разам з тым В. У. Чапко адзначае, што ў 1920-я гг. разгляд пытанняў, звязаных з пераходным этапам ад феадалізму да капіталізму, быў вузкім [14, с. 6], што на самай справе не зусім так. Аўтар узгадала публікацыі толькі М. В. Доўнар-Запольскага, прааналізавала артыкулы М. В. Мялешкі і Д. Жарынава, але ўвогуле праігнаравала працу У. І. Пічэты «История сельского хозяйства и землевладения в Белоруссии» [15].

Даволі грунтоўны аналіз прац У. І. Пічэты прадстаўлены ў даследаванні А. П. Ігнаценкі «Введение в историю БССР» [16]. Праца гісторыка заслугоўвае нашай увагі, таму, што, па-першае, ў ёй прадстаўлена перыядызацыя гісторыі Беларусі. Храналагічныя рамкі нашага даследавання (канец XVIII – першая палова XIX ст.) у працы А. П. Ігнаценкі вызначаны як перыяд разлажэння феадальных адносін і зараджэння капіталістычных, што сцвярджаем і мы ў выніку праведзеных навуковых пошукаў. Праца А. П. Ігнаценкі каштоўная характарыстыкай крыніц па гісторыі Беларусі, якая прадстаўлена храналагічнай і відавой класіфікацыямі: крыніц эпохі феадалізму, капіталізму і сацыялізму, прадстаўленых летапісамі, Літоўскай метрыкай, прывілеямі, інвентарамі, камеральнымі і эканамічнымі дапаўненнямі, актавымі кнігамі, дакументамі мытнага справаводства і г. д. Асобна аўтар прааналізаваў апублікаваныя дакументы па гісторыі Беларусі. Заслугоўваюць увагі галоўныя напрамкі ў развіцці гістарыяграфіі Беларусі, якія вылучыў А. П. Ігнаценка: гісторыя Беларусі ў трактоўцы дваранскай і буржуазнай гістарыяграфіі, у межах якой згадваюцца такія даследчыкі, як М. Г. Устралаў, С. М. Салаўёў, В. В. Ключэўскі, В. В. Тур-

чыновіч, П. Д. Бранцаў, М. Ф. Уладзімірскі-Буданаў, М. К. Любаўскі і інш. Гісторык справядліва лічыў, што ліберальна-буржуазны кірунак у гістарыяграфіі канца XIX – пачатаку XX ст. прывёў да пашырэння прадмета гістарычнага даследавання Беларусі – сацыяльнай і эканамічнай гісторыі. А. П. Ігнаценка становуча ацаніў працы М. В. Доўнар-Запольскага па эканамічнай гісторыі Беларусі XV–XVI стст., яго даследаванні становішча рамяства і гандлю ў гарадах Беларусі, грашовай і падатковай сістэм, а таксама гісторыі беларускай дзяржаўнасці. А. П. Ігнаценка дае кароткія звесткі з польскай гістарыяграфіі, прысвечаныя гісторыі Беларусі. Названы прозвішчы такіх даследчыкаў, як Т. Нарбут, Я. Лялявель, Ю. Ярашэвіч і інш. Даследчык адзначыў вялікадзяржаўныя погляды польскіх гісторыкаў і іх імкненне паказаць станоўчы ўплыў шляхецкай Рэчы Паспалітай на развіццё эканомікі і культуры Беларусі. Але польскія гісторыкі пакідалі па-за ўвагай феадальна-прыгонніцкі, нацыянальны і рэлігійны прыгнёт беларускага народа [16, с. 34].

А. П. Ігнаценка вылучаў два перыяды ў развіцці савецкай беларускай гістарыяграфіі: пачатак першага ён звязаў з адкрыццём Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 1921 г., а пачатак другога звязаны з заканчэннем Вялікай Айчыннай вайны. Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі ў працы даследчыка змешчаны разважанні наконт фальсіфікацыі гісторыі беларускага народа, пытанняў дзяржаўнасці і ролі Вялікага Княства Літоўскага.

Новай ступенню ў развіцці гістарыяграфіі гісторыі Беларусі стаў перыяд 80-х – сярэдзіны 90-х гг. XX ст., калі адразу выйшла некалькі прац, прысвечаных менавіта гістарычнай навуцы. Адной з першых выйшла праца У. М. Міхнюка «Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941 гг.)» [17], дзе ў раздзеле «Историография феодальной Белоруссии» пададзены пералік манаграфій, артыкулаў і дысертацый па сацыяльнай, палітычнай, эканамічнай, нацыянальнай і канфесіянальнай гісторыі перыяду канца XVIII – першай паловы XIX ст. Даволі падрабязна былі разгледжаны працы У. І. Пічэты і вызначаны яго паслядоўнікі – Т. І. Забела і К. І. Кернажыцкі [17, с. 217].

У. М. Міхнюк адзначыў, што гісторыкі 20-х гг. XX ст. правялі навуковы аналіз асноўных праблем у вывучэнні гісторыі Беларусі эпохі феадалізму і дасягнулі значных поспехаў пры разглядзе сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх земляў. Менавіта гэтыя даследаванні сталі базай для прац, напісаных у 1930-я – 1940-я гг. ужо з марксісцка-ленінскіх метадалагічных пазіцый.

Напрыканцы 1980-х гг. быў падрыхтаваны шэраг дапаможнікаў па айчыннай гістарыяграфіі [18–20]. У працы А. М. Лютага [19] даецца аналіз навуковых даследаванняў, прысвечаных праблемам генезісу капіталізму ў Расіі. Аўтар паставіў задачу высветліць, што ляжала ў аснове распаду феадальна-прыгонніцкіх адносін і зараджэння якасна новых капіталістычных форм.

Асобна трэба адзначыць манаграфію Э. Р. Іофе «Из истории белорусской деревни (Советская историография социально-экономического развития белорусской деревни середины XVII – первой половины XIX в.)» [21]. Даследаванне ўключае грунтоўны аналіз прац не толькі беларускіх, але і рускіх, украінскіх, літоўскіх і польскіх гісторыкаў.

Савецкія гісторыкі-навукоўцы шмат увагі звярталі на пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця і аграрных працэсаў. Трэба адзначыць і багаты эмпірычны матэрыял, які яны выкарыстоўвалі, але некрытычная трактоўка фактаў гістарычнай рэчаіснасці скавала творчую ініцыятыву айчынных гісторыкаў. Для нацыянальнай гістарыяграфіі савецкага перыяду была характэрна адаптацыя беларускай гісторыі, асабліва перыяду станаўлення капіталізму, да афіцыйнага курсу пры даследаванні праблем гісторыіі СССР. Агульнасаюзныя гістарычныя тэндэнцыі абавязкова павінны былі прысутнічаць і ў гісторыі Беларусі.

Толькі з сярэдзіны 1990-х гг. пачалі выходзіць больш крытычныя публікацыі па аграрнай праблематыцы (П. А. Лойка, В. Ф. Голубеў, А. Л. Кіштымаў, І. Ф. Кітурка, А. М. Люты). Пры гэтым захоўвалася кола гісторыкаў савецкага перыяду, якія засталіся вернымі марксісцка-ленінскай метадалогіі. Напрыклад, публікацыі В. П. Панюціча выкананы ў рэчышчы той жа марксісцка-ленінскай канцэпцыі развіцця гісторыі. Даследчык адмаўляў спробы сучасных гісто-

рыкаў перапісаць аграрную гісторыю Беларусі на аснове новых «канцэпцый» [22, с. 279]. П. Ц. Петрыкаў увогуле пісаў пра тое, што спробы некаторых сучасных гісторыкаў адмовіцца ад класавага зместу гістарычных рэалій выклікаюць толькі іронію [23, с. 4].

Такія ідэалагізаваныя падыходы да аналізу гісторыі крытыкуе ў сваім артыкуле У. А. Сосна [24]. Ён адзначае, што гісторыя феадалізму – гэта перш за ўсё гісторыя ніжэйшых станаў грамадства, і іх вывучэнне для савецкіх гісторыкаў мела першаступеннае значэнне. Хоць ва ўмовах партыйнага кіравання гуманітарнымі навукамі нават гэтыя прыярытэты не забяспечвалі ні паўнаты, ні аб'ектыўнасці іх даследавання. Пры ўсёй «дазволенасці» сацыяльна-эканамічнай праблематыкі у савецкі час і ў падручніках, і ў навуковых працах беларускае сялянства падавалася як нікчэмнае і забітае. Затое класавая барацьба нібыта набывала шырокі размах, бо некаторыя гісторыкі ў адпаведнасці з ідэалагічнай кан'юнктурай (З. Ю. Капыскі, В. У. Чапко, У. М. Міхнюк, П. Ц. Петрыкаў) імкнуліся літаральна кожнае зафіксаванае ў крыніцах выступленне сялян, працоўных горада, ледзьве не бойку прызнаць антыфеадальным паўстаннем і надаць статус «паўстання», «выступлення» і г. д. [24, с. 231].

Палітычную падаплёку марксісцка-ленінскай канцэпцыі аб рэакцыйнасці памешчыцкай гаспадаркі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. і неабходнасці яе ліквідацыі для забеспячэння прагрэсу сельскай гаспадаркі адзначаў А. П. Жытко [25]. Даследчык лічыў, што ступень капіталізацыі памешчыцкай гаспадаркі ў працах беларускіх савецкіх гісторыкаў была перабольшанай.

**Заключэнне**

З пачаткам новага тысячагоддзя гістарыяграфія аграрнай праблематыкі зноў набывае актуальнасць (артыкулы В. А. Белазаровіча, А. М. Нечухрына) [26; 27]. А. М. Нечухрын у артыкуле «Формирование аграрной истории как научного направления» [27, с. 116–120] закранае такую важную праблему, як даследаванне аграрнай гісторыі як самастойнага прадмета і фарміраванне асобнага адгалінавання ў гістарыяграфіі. Пачынальнікам беларускай аграрнай гісторыі аўтар называе М. В. Доўнар-Запольскага. Улічваючы вопыт даследаванняў аграрнай праблематыкі еўрапейскіх краін, А. М. Нечухрын адзначае, што напачатку XX ст. аграрная гісторыя выступае як сфарміраваны кірунак навуковых пошукаў. У айчыннай гістарыяграфіі аграрная гісторыя Беларусі і па сённяшні дзень аналізуецца ў праблемным полі сацыяльна-эканамічнай гісторыі.

Для сучаснай Беларусі з яе эканомікай пераходнага тыпу даследаванні праблем генезісу капіталізму ў аграрным сектары могуць мець прынцыповае значэнне. Гісторыкі пераасэнсоўваюць многія метадалагічныя ўстаноўкі, падводзяць вынікі і акрэсліваюць напрамкі далейшага даследавання аграрнай гісторыі Беларусі. Улічваючы, што аграрная гісторыя Беларусі – гэта неад'емная частка гісторыі дзяржавы і важны кампанент сучаснасці, можна сцвярджаць: яна павінна стаць самастойным прадметам айчынных даследаванняў.

А. А. Каваленя яшчэ ў 2010 г. на III Міжнародным кангрэсе гісторыкаў узняў такое важнае пытанне, як неабходнасць навуковай распрацоўкі гістарычнай спадчыны Беларусі ў сувязі з геапалітычным становішчам нашай краіны на скрыжаванні шляхоў і ва ўмовах цывілізацыйнага разлому. Усе больш сустракаецца выпадаў з боку заходнеўрапейскіх краін на высновы айчынных гісторыкаў аб беларусах як самастойнай нацыі ў асяродку еўрапейскіх народаў.

А. А. Каваленя крытыкуе гісторыкаў за пасіўнасць і заклікае актывізаваць даследаванні, захаваць гістарычную спадчыну і памяць, каб не адбылося «перапісвання гісторыі» [28]. Ён узгадвае ўсіх знакавых гісторыкаў Беларусі (У. М. Ігнатоўскага, І. М. Ігнаценку, П. Ц. Петрыкава і інш.), вызначае перыяды, калі гістарычная навука развівалася і пераадольвала крызісы.

Таму вельмі важна, каб і сёння беларуская гістарычная думка мела свой голас і ўлічвала сучасныя тэндэнцыі развіцця расійскай, еўрапейскай і сусветнай гістарычнай навукі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Пьенков, А. П. Изучение истории народов СССР. Основные этапы в развитии белорусской историографии за 30 лет / А. П. Пьенков // Наука в БССР за 30 лет. – Минск, 1949. – С. 451–455, 456–471.

2. Пичета, В. И. Введение в Русскую историю (Источники и историография) / В. И. Пичета. – М. : Гос. изд-во, 1922. – 192 с.

3. Довнар-Запольский, М. В. История Белоруссии / М. В. Довнар-Запольский. – 3-е изд. – Минск : Беларусь, 2011. – 591 с.

4. Ігнатоўскі, У. М. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецця : лекцыі, чытаныя студэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту / У. М. Ігнатоўскі. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1925. – 251 с.

5. Шчарбакоў, В. К. Нарыс гісторыі Беларусі / В. К. Шчарбакоў. – Мінск : Выд-ва Беларус. акад. навук, 1934. – 238 с.

6. Шчарбакоў, В. К. Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі / В. К. Шчарбакоў. – Мінск : Выд-ва Беларус. акад. навук, 1934. – 104 с.

7. Похилевич, Д. Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI–XVIII вв. – Львов : Изд-во Львов. ун-та, 1957. – 179 с.

8. Похилевич, Д. Л. «Капиталистические» зигзаги в истории феодального поместья / Д. Л. Похилевич // Вопросы истории сельского хозяйства, крестьянства и революционного движения в России. – М. : АН СССР, 1961. – С. 44–53.

9. Похилевич, Д. Л. Крестьяне-слуги в Великом княжестве Литовском в XVII–XVIII вв. / Д. Л. Похилевич // Средние века. – М, 1962. – Т. 21. – С. 141–169.

10. Похилевич, Д. Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы во второй половине XVIII века / Д. Л. Похилевич. – Вильнюс : АН Литов. ССР, Ин-т истории, 1966. – 216 с.

11. Улащик, Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии / Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1965. – 478 с.

12. Улащик, Н. Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1973. – 302 с.

13. Козловский, П. Г. Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII–XVIII в. (по материалам магнатски вотчин) / П. Г. Козловский. – Минск : Наука и техника, 1969. – 203 с.

14. Чепко, В. В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в. / В. В. Чепко. – Минск : Наука и техника, 1966. – 218 с.

15. Тукайла, Н. К. Даследаванні айчынных гісторыкаў гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. / Н. К. Тукайла // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2012. – № 2 (72). – С. 13–15.

16. Игнатенко, А. П. Введение в историю БССР. Периодизация, источники, историография / А. П. Игнатенко. – Минск : Высш. шк., 1965. – 48 с.

17. Михнюк, В. Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941 гг.) / В. Н. Михнюк. – Минск : Наука и техника, 1985. – 286 с.

18. Копысский, З. Ю. Историография БССР (эпоха феодализма) : учеб. пособие / З. Ю. Копысский, В. В. Чепко ; под ред. Я. Н. Мараша. – Минск : Университетское, 1986. – 175 с.

19. Лютый, А. М. Историография и источники по проблеме генезиса капитализма в России и ее национальных регионах : учеб.-метод. пособие / А. М. Лютый. – Минск : Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького, 1989. – 101 с.

20. Иоффе, Э. Г. Историография истории СССР : учеб. пособие / Э. Г. Иоффе. – Минск, 1986. – 105 с.

21. Иоффе, Э. Г. Из истории белорусской деревни (Советская историография социально-экономического развития белорусской деревни середины XVII – первой половины XIX в.) / Э. Г. Иоффе. – Минск, 1990. – 248 с.

22. Панютич, В. П. Историография аграрной истории Беларуси 1861–1917 гг. / В. П. Панютич // Проблемы методологии исследований истории Беларуси : материалы Междунар. науч. конф., Минск, 26–27 окт. 2006 г. – Минск, 2008. – С. 279–281.

23. Петриков, П. Т. Очерки новейшей историографии Беларуси (1990-е – начало 2000-х годов) / П. Т. Петриков. – Минск : Белорус. наука, 2007. – 292 с.

24. Сосна, У. А. Палітычная гісторыя познафеадальнай Беларусі ў працах выкладчыкаў кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў БДУ: традыцыі і сучаснасць / У. А. Сосна // Исследования по истории Восточной Европы : науч. сб. – Минск : РИВШ, 2014. – Вып. 7. – С. 231–244.

25. Жытко, А. П. Некалькі міфаў з аграрнай гісторыі Беларусі перыяду капіталізму ў айчыннай гістарыяграфіі / А. П. Жытко // Актуальныя пытанні гістарыяграфіі айчыннай і сусветнай гісторыі : зб. навук. пр. / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка ; рэдкал.: М. М. Забаўскі [і інш.] ; навук. рэд. А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2012. – С. 127–130.

26. Белозорович, В. А. Изучение социально-экономической истории в белорусской историографии / В. А. Белозорович // Историография социально-экономической истории Беларуси и России: смена парадигм : материалы Междунар. науч. конф., Гродно, 19–20 окт. 2017 г. / ГрГУ им. Я. Купалы ; редкол.: А. Н. Нечухрин (гл. ред.) [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2018. – С. 3–9.

27. Нечухрин, А. Н. Формирование аграрной истории как научного направления / А. Н. Нечухрин // Историография социально-экономической истории Беларуси и России: смена парадигм : материалы Междунар. науч. конф., Гродно, 19–20 окт. 2017 г. / ГрГУ им. Я. Купалы ; редкол.: А. Н. Нечухрин (гл. ред.) [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2018. – С. 116–120.

28. Каваленя, А. А. Гістарычная навука Беларусі на пераломе эпох: выклік часу / А. А. Каваленя // Гістарычна-археалагічны зборнік. Да юбілею з дня заснавання Інстутута гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2010. – Вып. 25. – С. 6–13.

## REFERENCES

1. P’jenkov, A. P. Izuchienije istorii narodov SSSR. Osnovnyje etapy v razvitii bielorusskoj istoriografii za 30 liet / A. P. P’enkov // Nauka v BSSR za 30 liet. – Minsk, 1949. – S. 451–455, 456–471.

2. Pichieta, V. I. Vviedenije v Russkuju istoriju (Istochniki i istoriografija) / V. I. Pichieta. – M. : Gos. izd-vo, 1922. – 192 s.

3. Dovnar-Zapol’skij, M. V. Istorija Bielorussii / M. V. Dovnar-Zapol’skij. – 3-je. – Minsk : Bielarus’, 2011. – 591. – S. 4.

4. Ihnatouski, U. M. Historyja Bielarusi u XIX i u pachatku XX stalieccia : liekcyi, chytanyja studentam Bielaruskaha dziarzhaunaha univiersitetu / U. M. Ihnatouski. – Miensk : Dziarzh. vyd-va Bielarusi, 1925. – 251 s.

5. Shcharbakou, V. K. Narys historyi Bikelarusi / V. K. Shcharbakou. – Minsk : Vyd-va Bielarus. akad. navuk, 1934. – 238 s.

6. Shcharbakou, V. K. Klasavaja barac’ba i histarychnaja navuka na Bielarusi / V. K. Shcharbakou. – Minsk : Vyd-va Bielarus. akad. navuk, 1934. – 104 s.

7. Pokhilevich, D. L. Kriest’janie Bielorussii i Litvy v XVI−XVIII vv. – L’vov : Izd-vo L’vov. un-ta, 1957. – 179 s.

8. Pokhilievich, D. L. «Kapitalisticheskie» zigzagi v istorii fieodal’nogo pomiest’ja / D. L. Pokhilievich // Voprosy istorii siel’skogo khozyajstva, kriest’janstva i rievoliucionnogo dvizhenija v Rossii. – M. : AN SSSR, 1961. – S. 44–53.

9. Pokhilevich, D. L. Kriest’janie-slugi v Vielikom kniazhestvie Litovskom v XVII−XVIII vv. // Sriednije vieka, 1962. – T. 21. – S. 141–169.

10. Pokhilevich, D. L. Kriest’janie Bielorussii i Litvy vo vtoroj polovinie XVIII vieka / D. L. Pokhilievich. – Vil’nius : AN Litov. SSR, In-t istorii, 1966. – 216 s.

11. Ulashchik, N. N. Priedposylki kriest’janskoj rieformy 1861 g. v Litvie i Zapadnoj Bielorussii / N. N. Ulashchik. – M. : Nauka, 1965. – 478 s.

12. Ulashchik, N. N. Ochierki po arkhieografii i istochnikoviedieniju istorii Bielorussii fieodal’nogo pierioda / N. N.Ulashchik. – M. : Nauka, 1973. – 302 s.

13. Kozlovskij, P. G. Kriest'janie Bielorussii vo vtoroj polovinie XVII – XVIII v. (Po matierialam magnatatskikh votchin) / P. G. Kozlovskij. – Minsk : Nauka i tiekhnika, 1969. – 203 s.

14. Chepko, V. V. Siel’skoje khoziajstvo Bielorussii v piervoj polovinie XIX v. / V. V. CHepko. – Minsk : Nauka i tiekhnika, 1966. – 218 s.

15. Tukajla, N. K. Dasliedavanni ajchynnykh historykau ghstaryjagrafii ahrarnaj historyi Bielarusi kan’ca XVIII pershaj palovy XIX st. / N. K. Tukajla // Vesn. Bielarus. dziarzh. un-ta. Sier. 2, Historyja. Filasofija. Palitalohija. Sacyjalohiya. Ekanomika. Kul’turaloghija. – 2012. – № 2 (72). – S. 13–15.

16. Ignatienko, A. P. Vviedienije v istoriju BSSR. Pieriodizacija, istochniki, istoriografija / A. P. Ignatienko. – Minsk : Vyssh. shk., 1965. – 48 s.

17. Mikhniuk, V. N. Stanovlienije i razvitije istorichieskoj nauki Sovietskoj Bielorussii (1919–1941 gg.) / V. N. Mikhnyuk. – Minsk : Nauka i tiekhnika, 1985. – 286 s.

18. Kopysskij, Z. Yu. Istoriografija BSSR (epokha fieodalizma) : uchieb. posobije / Z. Yu. Kopysskij, V. V. Chepko ; pod ried. Ya. N. Marasha. – Minsk : Univiersitetskoje, 1986. – 175 s.

19. Liutyj, A. M. Istoriografija i istochniki po probliemie gienezisa kapitalizma v Rossii i jejo nacional’nykh regionakh : uchieb.-mietod. posobije / A. M. Liutyj. – Minsk : Min. gos. pied. in-t im. A. M. Gor’kogo, 1989. – 101 s.

20. Joffe, E. G. Istoriografija istorii SSSR : uchieb. posobije / E. G. Joffe. – Minsk, 1986. – 105 s.

21. Joffe, E. G. Iz istorii bielorusskoj dierievni (Sovietskaja istoriografija social’no-ekonomichieskogo razvitija bielorusskoj dierievni sieriediny XVII – piervoj poloviny XIX v.) / E. G. Joffe. – Minsk, 1990. – 248 s.

22. Paniutich, V. P. Istoriografija agrarnoj istorii Bielarusi 1861–1917 gg. / V.P. Panyutich // Problemy metodologii issledovanij istorii Belarusi : materialy Mezhdunar. nauch. konf., Minsk, 26–27 okt. 2006 g. – Minsk, 2008 – S. 279 – 281

23. Pietrikov, P. T. Ochierki noviejshej istoriografii Bielarusi (1990-je – nachalo 2000-kh godov) / P. T. Pietrikov. – Minsk : Bielorus. nauka, 2007. – 292 s.

24. Sosna, U. A. Palitychnaja historyja poznafieadal’naj Bielarusi u pracakh vykladchykau kafiedry historyi Bielarusi starazhytnaha chasu i siarednikh vyikoў BDU: trvdycyi i suchasnasc’ / U. A. Sosna // Issliedovanija po istorii Vostochnoj Jevropy : nauch. sb. – Minsk : RIVSH, 2014. – Vyp. 7. – S. 231–244.

25. Zhytko, A. P. Niekal’ki mifau z ahrarnaj historyi Bielarusi pieryjadu kapitalizmu u ajchynnaj histaryjahrafii / A. P. Zhytko // Aktual’nyja pytanni histaryjahrafii ajchynnaj i susvietnaj historyi : zb. navuk. pr. / Bielarus. dziarzh. pied. un-t imia M. Tanka ; redkal.: M. M. Zabauski [i insh.] ; navuk. red. A. P. Zhytko. – Minsk : BDPU, 2012. – S. 127–130.

26. Bielozorovich, V. A. Izuchienije social’no-ekonomichieskoj istorii v bielorusskoj istoriografii / V. A. Bielozorovich // Istoriografiya social’no-ekonomichieskoj istorii Bielarusi i Rossii: smiena paradigm : matierialy Miezhdunar. nauch. konf., Grodno, 19–20 okt. 2017 g. / GrGU im. Ja. Kupaly ; riedkol.: A. N. Niechuhrin (gl. reid.) [i dr.]. – Grodno : GrGU, 2018. – S. 3–9.

27. Niechuhrin, A. N. Formirovanije agrarnoj istorii kak nauchnogo napravlienija / A. N. Niechuhrin // Istoriografija social’no-ekonomichieskoj istorii Bielarusi i Rossii: smiena paradigm : matierialy Miezhdunar. nauch. konf., Grodno, 19–20 okt. 2017 g. / GrGU im. Ja. Kupaly ; riedkol.: A. N. Niechuhrin (gl. ried.) [i dr.]. – Grodno : GrGU, 2018. – S. 116–120.

28. Kavalienia, A. A. Histarychnaja navuka Bielarusi na pieralomie epokh: vyklik chasu / A. A. Kavalienia // Histarychna-arkhiealagichny zbornik. Da jubilieju z dnia zasnavannia Instututa historyi NAN Bielarusi. – Minsk, 2010. – Vyp. 25. – S. 6–13.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 23.02.2024*